Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 МАЯ 2018 г. СУБОТА № 94 (28710)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Распрацоўкі для сувязі і кібербяспекі**

СТАР. 4



**Космас Палесся... і Горвата**

СТАР. 8



**Лялечны тэатр і для дарослых**

СТАР. 9

*ЛІЧБА ДНЯ*

**25 тысяч навучэнцаў**

*планууецца працаўладкаваць сёлета на часовыя работы ў вольны ад вучобы час. У 2018 годзе памер фінансавых сродкаў на забеспячэнне занятасці моладзі ў параўнанні з 2017 годам павялічаны на 10 %. Летась планавалася працаўладкаваць 24 тысячы маладых людзей, па выніку забяспечылі работай 29 тыс. хлопчыкаў і дзяўчынак. Узровень аплаты працы па прапанаваных вакансіях знаходзіцца ў межах памеру мінімальнай заработнай платы. Моладзі прапануецца ў асноўным некваліфікаваная праца: прыборка тэрыторый, азеляненне, добраўпарадкаванне ўстаноў адукацыі і сацыяльнай абароны, рэстаўрацыя бібліятэчнага фонду, выраб сувеніраў, пашыў швейных вырабаў, вырошчванне сельгаспрадукцыі. Таксама ў краіне ўдасканальваецца прававая база, фарміруецца банк даных наяўных вакансій.*

ISSN 1990 - 763X

# На роднай зямлі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Маладая сям'я з Мазыра Алег і Ірына ЯРАЦЫ са сваімі сынамі Міхаілам і Уладам кожныя выхадныя прыязджаюць у вёску Таргашын Петрыкаўскага раёна ў дом бабулі Алега, каб працаваць на зямлі: на ўчастку яны вырошчваюць садавіну і агародніну. А калі выпадае вольная часіна, Ярацы ў поўным складзе на сваім квадрацыкле з задавальненнем вандруюць па ваколіцах і суседніх вёсках.**

■ Новы фармат

## «МАТОРЧЫК» ДЛЯ БАБУЛІ

### Як пажыломму чалавеку не адстаць ад жыцця

**У сталічным Цэнтры актыўнага даўгалецця нядаўна адкрылася антыкафэ для пажылых людзей. Першае мерапрыемства, на якое запрасілі ўсіх ахвотных, аказалася літаратурна-гістарычным — «Падарожжа ў часе: гісторыя майго месца». У спісе гасцей значылася ўнучка беларускіх пісьменнікаў Янкі Маўра і Якуба Коласа Марыя Міцкевіч.**

«Мы хочам, каб пажылыя людзі не адставалі ад жыцця, — кажа **Алена МАРЫГЕРОЎСКАЯ, намеснік дырэктара Цэнтра актыўнага даўгалецця**. — Самае лепшае, што ў іх ёсць, — гэта час. І яны могуць праводзіць яго тут».

СТАР. 13



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Наталля ХАЗЯЕВА** *(злева)* **і Вольга ШАТЫКА п'юць гарбату ў антыкафэ.**

■ Пераходны ўзрост

## ЦЯЖКІЯ ТЫЯ, КАМУ ЦЯЖКА

### Як падлеткі становяцца законапаслухмянымі

**У Беларусі налічваецца чатыры спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя прафесійныя тэхнічныя вучылішчы закрытага тыпу для падлеткаў. Адно з іх знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Крывічы, што ў Мядзельскім раёне.**

І калі з прыёмніка-размеркавальніка сюды прывозяць чарговага юнага правапарушальніка, яму рэальна страшна: высокая агароджа, моцныя вароты, шлагбаум. Ды ўсе страхі праходзяць, як толькі ён ступае на тэрыторыю ўстановы. Таму што бачыць: тут ідзе звычайнае жыццё. Хлопцы ганяюць мяч на стадыёне, гуляюць у валейбол, займаюцца на трэнажорах, працуюць у вытворчых майстэрнях. Пасля адбывання тэрміну не ўсе ахвотна вяртаюцца дадому, дзе ніколі сытна не елі, не спалі ў чыстых пасцелях. А тут добры дагляд, якасная ежа, розныя мерапрыемствы, спаборніцтвы.

У спецвучылішчы жывуць, вучацца, набываюць прафесію выхаванцы ад 12 да 18 гадоў. Усе яны здзейснілі правапарушэнне, якое не ўяўляе вялікай небяспекі для грамадства, у асноўным хуліганства. У кожнага падлетка свая гісторыя, але, як правіла, яны падобныя адна на адну. Звязаўся з дрэннай кампаніяй, першы раз выпіў, спадабалася. Далей — болей: падсеў на наркотыкі, распачаў бойку. І ўсё глыбей засягвала багна, з якой самастойна выбрацца немагчыма. На жаль, такі лёс напаткаў не толькі дзяцей-сірот, дзяцей з неўладкаваных, няпоўных сем'яў, але і тых, у каго заможныя бацькі: бізнесмены, прадпрымальнікі.

— Пазнаёміўся з хлопцамі, якіх лічыў сваімі сябрамі. Цяпер разумею, што яны ніякія мне не сябры. Пастаянна ладзілі гулянкі са спіртным, — кажа Ілья.

— На чые грошы? — пытаюся ў яго.

— Бацькі ў мяне забяспечаныя, грошай не шкадавалі, ды і сам нешта зарабляў падпрацоўкамі. Вядома, тата і мама спрабавалі мяне спыніць, ушчувалі. Ды я іх не слухаў. Вучылішча, зразумела, — не дом, але я не шкадую, што сюды трапіў. Тут ёсць час задумацца над сваімі паводзінамі і далейшым жыццём, — гучыць у адказ.

СТАР. 7

# ПРААНАЛІЗАВАЦЬ І ЗРАБІЦЬ ВЫСНОВЫ

**У апошнія гады на беларуска-эквадорскія адносіны ўплывалі некалькі фактараў. У Эквадоры былі значна скарочаны расходныя артыкулы дзяржбюджэту, замарожаны нацыянальныя праекты, уступіў у сілу дагавор аб свабодным гандлі з Еўрасаюзам. Але пры ўсім гэтым узаемны тавараабарот вырас, няхай і за кошт эквадорскага імпарту. Пра тое, як надалей развіваць двухбаковае супрацоўніцтва і выраўноўваць яго, ішла гутарка паміж Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і міністрам замежных спраў і міграцыі Эквадора Марыяй Фернанда Эспіноса Гарсэс.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паміж Беларуссю і Эквадорам склаліся добрыя палітычныя адносіны. У нас падобныя пазіцыі па міжнародным парадку дня, мы эфектыўна супрацоўнічаем ва ўсіх міжнародных арганізацыях, асабліва ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. «І мы гатовы падтрымаць вашу кандыдатуру на пасаду старшыні чарговай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН», — заявіў беларускі лідар.

«У нас з Эквадорам такі перыяд, калі трэба было б падвергнуць рэвізіі нашы адносіны. Паглядзець, што атрымалася, магчыма, ад чагосьці адмовіцца і намеціць канкрэтны план дзеянняў на найбліжэйшую перспектыву, тым больш што ў Эквадоры, блізкай нам краіне, апошнім часам адбыліся пэўныя палітычныя рэформы, і яны яшчэ не скончаныя, наколькі я інфармаваны, і я вельмі спадзяюся, што ў гэты вельмі важны перыяд, фарміруючы гэты план, вы з нашым міністрам дамовіцеся ў тым ліку і аб кантактах на вышэйшым узроўні. Але вы ведайце, што мы заўжды рады бачыць вашага Прэзідэнта ў Беларусі. У любы зручны для яго час», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, асновай двухбаковых адносін, а таму і асновай «дарожнай карты» стасункаў, павінна стаць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. «Пагадзіцеся, што нам не варта браць на сябе абавязкі, якія мы не зможам выканаць: ні Эквадор, ні Беларусь. Таму і патрэбна рэвізія ўсяго зробленага і старых планаў. Але тым не менш нашы планы стратэгічныя, на перспектыву, павінны быць дастаткова напружаныя. Мы павінны ўзяць на сябе абавязкі, каб і тавараабарот дыверсіфікаваць, і павысіць яго», — дадаў Прэзідэнт. Але важна, каб дзве краіны былі партнёрамі не толькі на словах. «Я вельмі разлічваю на рэальны план дзеянняў на перспектыву», — падкрэсліў беларускі лідар.

Па словах кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Эквадора, краіны значна прасунуліся ў двухбаковым супрацоўніцтве, але недастаткова. «Ёсць яшчэ шмат таго, што мы павінны зрабіць менавіта сумеснымі намаганнямі», — адзначыла яна. У Эквадора вялікі інтарэс і ў падпісанні ўсеабдымнага пагаднення аб супрацоўніцтве з Еўразійскім эканамічным саюзам, у якім Беларусь іграе значную ролю.

***

Таксама міністр замежных спраў Эквадора Марыя Фернанда Эспіноса Гарсэс сустрэлася з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем, перадае БелТА. На перагаворах яна падкрэсліла, што Беларусь і Эквадор за 25 гадоў дыпламатычных адносін дасягнулі многага, але для развіцця трэба зрабіць яшчэ больш.

Пасля перагавораў міністраў замежных спраў Міністэрства культуры Беларусі і Міністэрства культуры і спадчыны Эквадора падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы культуры. Подпісы пад дакументам паставілі міністр культуры Юрый Бондар і кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Эквадора. У ім сказана, што бакі будуць імкнуцца да ўстанаўлення прамых кантактаў, а таксама дапамагаць адзін аднаму ў развіцці ўзаемадзеяння ў культурнай сферы.

Акрамя таго, з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Эквадора сустрэўся і старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка.

Ён адзначыў, што важны ўклад у развіццё двухбаковых адносін павінны ўнесці парламентарыі абедзвюх краін. Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што ў 2016 годзе было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж парламентамі. «У нас ужо створана такая прававая сістэма для развіцця супрацоўніцтва, — сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Важным інструментам у гэтым кірунку з'яўляюцца і групы дружбы, якія сфарміраваны пры парламентах нашых дзяржаў. Каб нарошчваць у цэлым наша супрацоўніцтва, нам трэба значна актывізаваць работу гэтых груп. Магчыма, трэба распрацаваць план дзеянняў або дарожную карту».

На яго думку, рэальна развіваць супрацоўніцтва ў галіне турызму, адукацыі, сумесную работу на міжнароднай арэне, а таксама паміж рэгіёнамі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,**
**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# МАШТАБ СУПРАЦОЎНІЦТВА АБАВЯЗВАЕ

**Плануецца, што ўжо ў чэрвені адбудзецца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітай. У горадзе Цындаа пройдзе саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Чакаецца, што на палях форуму будзе арганізавана сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Каб абмеркаваць падрабязнасці падрыхтоўкі да гэтай падзеі, была зладжана сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла КНР у Беларусі Цуй Цыміна.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што запрасіў кітайскага дыпламата, каб параіцца па некаторых пытаннях нашых адносін напярэдадні візіту ў Цындаа. «Напярэдадні маёй паездкі ў КНР у Беларусі будзе чалавек, які займае другі пост у іерархіі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Мы таксама абмяркуем з ім пытанні беларуска-кітайскіх узаемаадносін. А паколькі вы чалавек самы дасведчаны з усіх кітайскіх грамадзян у нашых адносінах, валодаеце ўсёй паўнатой інфармацыі, я таксама хацеў бы абмеркаваць з вамі шэраг момантаў не толькі напярэдадні гэтага візіту ў КНР, але і пагаварыць аб стратэгіі нашых адносін», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што нашы краіны маюць стратэгічны ўзровень супрацоўніцтва — і гэтым усё сказана. Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць і праблемныя пытанні. «Без праблем не бывае. Таму што маштаб супрацоўніцтва вельмі значны, асабліва ў «Вялікім камені». Хацеў бы пачуць ваш пункт гледжання, ваша бачанне. Можа, мы дзесьці недапрацоўваем. Асабліва з нашага боку. Мы ўлічым гэта ў супрацоўніцтве з вамі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

**Цуй ЦЫМІН, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі:**

— Напярэдадні саміта ШАС адбудзецца значны для абодвух бакоў візіт намесніка Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Ван Цішаня. Гэта будзе прыкладна напрыканцы мая. Візіт адбудзецца па запрашэнні прэм'ер-міністра Беларусі Андрэя Кабякова. Падзея вельмі важная, бо пасля выбрання на пасаду намесніка Старшыні для Ван Цішаня гэта першы візіт за мяжу. Ён сведчыць пра тое, што наша кіраўніцтва ўдзяляе значную ўвагу далейшаму развіццю ўзаемаадносін Беларусі і Кітая.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЦРУ ЎПЕРШЫНЮ ЎЗНАЧАЛІЛА ЖАНЧЫНА



Амерыканскі сенат адобрыў прызначэнне першай жанчыны на пост дырэктара ЦРУ. Кандыдатура Джыны Хаспел — ветэрана амерыканскай разведкі — выклікала нямала спрэчак з-за падазрэнняў у яе датычнасці да практыкі жорсткіх допытаў падазраваных у тэрарызме.

Усе 33 гады сваёй кар'еры ў Цэнтральным разведвальным упраўленні Хаспел працавала пад прыкрыццём і ў штаб-кватэры ЦРУ, і за мяжой, у прыватнасці ў Лондане.

Пры Джорджу Бушу-малодшым яна была адказная за таемныя турмы ЗША, у тым ліку кіравала сакрэтнай турмой у Тайландзе пасля тэрактаў 11 верасня 2001 года.

Менавіта гэты аспект яе работы выклікаў вострую палеміку. Дакладна невядома, ці брала яна асабіста ўдзел у допытах, якія многія амерыканскія праваабаронцы кваліфікавалі як катаванні, але, згодна з публічнай інфармацыяй, менавіта яна прыняла рашэнне знішчыць відэазапісы гэтых гутарак.

## ТРАМП ДАПУСЦІЎ ПАЎТОР «ЛІВІЙСКАГА СЦЭНАРЫЯ» Ў КНДР

Прэзідэнт ЗША не выключыў «лівійскага сцэнарыя» ў дачыненні да КНДР, калі не будзе падпісана пагадненне аб дэнуклеарызацыі. Дональд Трамп пры гэтым сказаў, што гэта «не тая мадэль, якую мы маем» для Паўночнай Карэі, адзначыўшы, што з лідарам Лівіі Муамарам Кадафі не было пагаднення аб захаванні яго на чале дзяржавы. Словы Трампа прыводзіць Bloomberg.

У Лівіі «было поўнае знішчэнне», дадаў амерыканскі прэзідэнт. «Мы пайшлі туды, каб перамагчы яго [Кадафі]. Цяпер такая ж мадэль, хутчэй за ўсё, будзе мець месца, калі мы не заключым здзелку. Але калі мы заключым яе, думаю, Кім Чэн Ын будзе вельмі, вельмі шчаслівы», — дадаў ён.

## АНАЛІТЫКІ ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ АБ РЭЦЭСІІ Ў РАСІІ АД НОВЫХ САНКЦЫЙ ЗША

Узмацненне жорсткасці санкцый ЗША прывядзе да рэцэсіі расійскай эканомікі, лічыць Morgan Stanley. Гэта ўжо трэці найбуйнейшы інвестбанк, які за апошні тыдзень пагоршыў краінавы эканамічны прагноз з-за абмежавальных мер Вашынгтона.

«Улічваючы больш высокую нявызначанасць у дачыненні да прагнозу па санкцыях, мы бачым больш негатыўны сцэнарый з скарачэннем ВУП на 0,5 % [у гадавым вымярэнні] у выпадку ўнясення некаторых расійскіх сістэмаўтваральных дзяржкампаній у санкцыйны спіс», — гаворыцца ў аглядзе. Аналітыкі не ўдакладнілі, пра якія канкрэтна кампаніі можа ісці гаворка. Негатыўны эфект ад новых абмежавальных мер не зможа нават нівеліраваць рост цэн на нафту да $ 70 за баррэль, упэўнены аналітыкі.

■ Блізкая ўлада

# «НА ВУЛІЦЫ ДОЖДЖ — У КВАТЭРЫ ПАТОП»

## Прыёмы грамадзян — магчымасць убачыць недапрацоўкі на месцах

**Дзесяць зваротаў разгледзеў старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА падчас выязнога прыёму грамадзян у Маладзечне. «Такія сустрэчы эфектыўныя, паколькі дазваляюць убачыць недапрацоўкі ўлады і прыняць адпаведныя рашэнні, — адзначыў Анатоль Міхайлавіч. — У розных раёнах Міншчыны пытанні, якія хвалююць людзей, істотна не адрозніваюцца. Гэта зямельныя адносіны, якія шмат гадоў не вырашаюцца, камунальныя пытанні, што датычацца ўмоў пражывання людзей, працяканне дахаў у жылых дамах, просьбы ўзаконіць самавольнае будаўніцтва. Шмат зваротаў з раёнаў індывідуальнай і кааператыўнай забудовы па ўладкаванні інфраструктуры».**

І ў Маладзечне не абышлося без гэтага. У прыватнасці, Іраіда Генадзеўна з гарадскога пасёлка Радашковічы прыйшла на прыём ад імя жыхароў вуліц Сонечнай, Каханоўскага і Коласа. Вуліцы пачалі забудоўваць яшчэ ў 1991 годзе. Але да гэтага часу тут адсутнічаюць неабходныя камунікацыі. Раён індывідуальнай забудовы месціцца ў нізіне, на гліністых глебах. Таму пасля дажджу або веснавога разводдзя тут ні праісці ні праехаць, вада цячэ ў падвалы, на агароды. Неабходна ўладкаваць сістэмы водаадводу, а таксама каналізацыі.

Сапраўды, такая праблема існуе, пацвердзіў выконваючы абавязкі дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Маладзечанскага раёна» Андрэй Казунка. Ён растлумачыў, што праект па добраўпарадкаванні гэтага раёна распрацаваны, але ён састарэў і патрабуе карэкціроўкі.

Старшыня Радашковіцкага пасялковага выканкама Віктар Неказакаў дадаў, што выручаныя за тры гады 156 тыс. рублёў ад продажу зямельных участкаў з аўкцыёнаў пайшлі на ўладкаванне вуліц. Але для таго, каб прывесці іх у належны стан, неабходна значна большыя сродкі.

Выслухаўшы меркаванні ўсіх бакоў, Анатоль Ісачанка даручыў Віктару Неказакаву правесці сход жыхароў і прапанаваць ім таксама паўдзельнічаць у агульнай справе, папярэдне вылічыўшы аб'ём і кошт работ. «Мы дапаможам з бюджэту. А вы зрабіце так, каб людзям было камфортна пражываць».

Такі адказ задаволіў заяўніцу. Яна выказала ўпэўненасць, што жыхары ўнясуць пасільны ўклад у добраўпарадкаванне.

Станіслаў Часлававіч і Тадэвуш Станіслававіч пражываюць у адным з дамоў па вуліцы Маладзёжнай. Яны звярнуліся да губернатара, каб пасадзейнічаў у рамонце даху. Праблема з «барадой» цягнецца ўжо шмат гадоў. Куды толькі не звярталіся, але сітуацыя не мяняецца: на вуліцы дождж — у кватэрах патоп. У выніку ад пастаяннай вільгаці псуецца мэбля, маёмасць, на сценах і столі з'явілася цвіль. Таму пад рукой заўсёды вёдры, тазы. Жыльцы пастаянна клеяць шпалеры, фарбуюць падлогу, сушаць рэчы, адзенне. Да наступнага ліўня...

Праўда, камунальнікі спрабавалі вырашыць праблему, ды кожны чарговы прыезд заканчваўся, што называецца, латаннем дзірак. Начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Сяргей Бохан адзначыў, што капітальны рамонт даху запланаваны на чацвёрты квартал гэтага года. Але людзі хвалююцца, што пачнуцца восеньскія дажджы, якія перашкодзяць справе. Анатоль Ісачанка даручыў ЖКГ не зацягваць з рамонтам і выканаць усе работы да першага верасня.

Алена Тургунбекаўна і Валянціна Уладзіміраўна расказалі, што не так даўно зацверджана новая інструкцыя аплаты за карыстанне інтэрнатам. У выніку даводзіцца штомесяц выкладваць за пражыванне і камунальныя паслугі па 160—180 рублёў пры зарплаце ў 300 рублёў. На тыя капейкі, што застаюцца, людзі літаральна выжываюць. Жанчыны звярталіся ў адпаведныя службы, каб ім знізілі суму. Але ў адказ пачулі, што ўтрыманне інтэрната стратнае, што з іх вылічваюць і за карыстанне агульнымі месцамі. «Чаму яно стратнае? — здзіўляліся кабеты. — Людзі за асабістыя сродкі робяць рамонт, мяняюць вокны, дзверы». Заяўніцы прасілі кіраўніка цэнтральнага рэгіёна адмяніць гэтае рашэнне. Губернатар адзначыў, што не мае такіх паўнамоцтваў. Разам з тым ён даручыў спецыялістам дэталёва вывучыць праблему, прааналізаваць, якія фактары ўплываюць на непрыбытковасць. А на працягу двух тыдняў даць заяўніцам адказ.

Шмат якія пытанні грамадзян вырашыліся падчас прыёму. Іншыя губернатар узяў на асабісты кантроль.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

■ Гучная справа

# Прадпрымальнік — рабаўладальнік

**Жыхар Вілейкі абвінавачваецца ў выкарыстанні паднявольнай працы. Пра гэта паведаміла афіцыйны прадстаўнік упраўлення следчага камітэта па Мінскай вобласці Таццяна БЕЛАНОГ. Расследаванне ў адносінах да індывідуальнага прадпрымальніка закончана. На яго ўзбуджана крымінальная справа на аснове матэрыялаў праверкі аддзела па супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Мінаблвыканкама.**

Трыццаціпяцігадовы мужчына на працягу двух апошніх гадоў пад пагрозай фізічнага насілля прымушаў людзей працаваць на яго. Аб усіх жахах рабства расказаў супрацоўнікам аддзела па супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Мінаблвыканкама адзін з «парабкаў», якому ўдалося ўцячы. Затым ён наогул некуды прапаў.

Сваякі звярнуліся ў міліцыю з заявай аб яго знікненні. Супрацоўнікі міліцыі знайшлі ўцекача на чыгуначным вакзале Віцебска, ён ехаў «хоць куды», абы далей ад рабаўладальніка. Такія з'явы, як працоўная эксплуатацыя, — рэдкасць для Беларусі, таму аператыўнікі карпатліва вывучалі ўсе абставіны справы.

Па словах пацярпелага, прыкладна два гады таму ён пачуў ад знаёмых, што чалавек шукае людзей для работы на прысядзібным участку і догляду за свойскай жывёлай. На той час мужчына не меў пастаяннай работы і падаўся да прадпрымальніка. Паўгода гаспадар сапраўды плаціў грошы і нават купляў адзенне работнікам. Але цягам часу пачаў суму заробку змяншаць. А затым наогул перастаў з імі разлічвацца. «Рабы» ўзбунтаваліся і перасталі выходзіць на работу, што не спадабалася гаспадару. Ён ведаў, што адзін з іх жыве ў суседняй вёсцы. Прыехаў да яго дадому, збіў да сінякоў, пагрузіў у багажнік машыны і прывёз назад. Як сцвярджаў пацярпелы, наймальнік пастаянна пагражаў яму расправай. За некалькі дзён ён так запалохаў мужчыну, што задушыў усялякае жаданне да супраціўлення. Ледзь што — у ход ішлі кулакі. На дапамогу гэты чалавек не спадзяваўся, а сельчане проста не хацелі ўмешвацца ў чужыя справы.

Часам паднявольны выказваў слабы пратэст, але ўсе спробы заканчваліся пабоямі. Відаць, навастпечаны рабаўладальнік адчуваў сябе вяршыцелем чужых лёсаў, а глумленне над асобай прыносіла яму вялікае задавальненне. Некалькі разоў ён «парабка» нават прыкоўваў ланцугом і пакідаў на ўсю ноч у хляве.

— Следчыя дапыталі сведак, правялі праверку паказанняў на месцы, атрыманы заключэнні судовых экспертыз, — канстатавала Таццяна Беланог. — У яго дома знойдзена незарэгістраваная паляўнічая стрэльба з боепрыпасамі, дробнакаліберныя патроны, а таксама банка з порахам і пашпарт на імя пацярпелага. Дзеянні абвінавачанага кваліфікаваны па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса, сярод якіх наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, выкраданне пашпарта і чалавека, выкарыстанне рабскай працы, незаконнае захаванне зброі, патронаў і выбуховых рэчываў. Прадпрымальнік знаходзіцца пад вартай. Крымінальная справа перададзена ў пракуратуру і будзе накіравана ў суд.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Не прапусці!

## ВЕДАЕШ МОВУ? ДАКАЖЫ!

**2 чэрвеня з 12.20 да 13.20 у Нацыянальнай бібліятэцы ў Мінску другі раз пройдзе «Агульная дыктоўка» па беларускай мове.**

Арганізатары не парушылі традыцыю і падрыхтавалі спецыяльны тэкст. Калі летась дыктоўка была прысвечана 950-годдзю сталіцы, то сёлета яе змест прысвячаецца 400-годдзю першага беларускага буквара. Чытальнікам праекта выступіць Руся — спявачка, актрыса беларускага дубляжу, «голас беларускай чыгункі».

Тыя, у каго не атрымліваецца прыехаць у сталіцу, таксама змогуць далучыцца і напісаць дыктоўку разам з Мінскам. Для гэтага будзе арганізавана трансляцыя праз Нацыянальнае радыё і інтэрнэт.

Для ўдзелу ў дыктоўцы неабходна зарэгістравацца па спасылцы http://lidskae.by/praektyi/agulnaya-dyiktouka-2018/. 2 чэрвеня трэба з'явіцца ў Нацыянальную бібліятэку (праспект Незалежнасці, 116) не пазней за 11.30 (уваход з боку рэстарана «Явар», другі паверх) альбо падключыцца да Першага канала Нацыянальнага радыё ці інтэрнэт-трансляцыі дома.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Факт

## Выраслі падаткі

### за здачу ўнаём у Мінскай вобласці

**У Мінскай вобласці больш чым на 6 % павялічыліся стаўкі падаходнага падатку ў фіксаваных сумах з фізічных асоб, якія атрымліваюць прыбытак ад здачы ў арэнду жылых, нежылых памяшканняў і машынамесцаў. Адпаведнае рашэнне прынята Мінскім абласным Саветам дэпутатаў.**

Памер ставак адрозніваецца па гарадах і тэрыторыях. Напрыклад, у Жодзіне за здачу ўнаём жылых памяшканняў (за кожны пакой), садовых домікаў, дач неабходна ў месяц заплаціць 16,5 рубля, за арэнду гаража — 4,2—5,3 рубля (у залежнасці ад віду); у Барысаве, Заслаўі, Маладзечне, Мар'інай Горцы, Слуцку, Смалявічах, Салігорску — 15,3 рубля, 4,2—5,3 рубля адпаведна; у іншых гарадах раённага падпарадкавання — 10 рублёў за пакой і ад 3,6 да 4,2 рубля за гараж.

Для населеных пунктаў, размешчаных на тэрыторыях Нарачанскага і Мядзельскага сельсаветаў, у перыяд з мая па верасень памер стаўкі роўны 41 рублю (за здачу ў арэнду жылых памяшканняў, садовых домікаў і дач) і ад 4,2 да 4,3 рубля (за здачу ў арэнду гаража); для населеных пунктаў Мінскага раёна — 15,3 рубля і ад 4,8 да 6,1 рубля адпаведна; для іншых тэрыторый — 9 рублёў і 3,5—4,2 рубля адпаведна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## «Пежо» вылецеў на могілкі

**Здарэнне адбылося ў Чэрвеньскім раёне на аўтадарозе Чэрвень—Ляды—Якшыцы. Легкавік занесла, і аўто вылецела на могілкі.**

Па інфармацыі УДАІ УУС Мінаблвыканкама, жыхарка Червеня на «Пежо-207» абганяла рэйсавы аўтобус і не справілася з кіраваннем. Яна з'ехала на правую па ходзе руху абочыну, машыну занесла. Пасля гэтага легкавік выехаў за межы праезнай часткі і ўрэзаўся ў бетонную агароджу могілак. Там аўто перавярнулася і пашкодзіла некалькі надмагілляў. Кіроўцу шпіталізавалі з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і пераломамі. Жанчына была прышпілена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ТРАНСБУГ»**

| Предмет торгов | |
|---|---|
| Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-345, общей площадью 72,1 кв. м (назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: КПП), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001008553, пл. 0,5862 га | |
| **Начальная цена без НДС:** 35 000,00 рубля | **Размер задатка:** 3 120,00 рубля |
| **Адрес объекта** | Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 114/2. |
| **Имущественные права на земельный участок** | Право постоянного пользования. |
| **Условия продажи** | С условиями |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договоракупли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 28 мая 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 28 мая 2018 г. до 10.00**

***Настоящее извещение дополняет сведения, опубликованные в газете «Звязда « от 26.04.2018 г.**

**ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОСТРОЙ» филиал «Мостоотряд № 58»**

| Предмет торгов | | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка |
|---|---|---|---|
| Лот – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-86216 (наименование – склад II группы; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 2 039,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029588 площадью 2,0163 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 108Г. Составные части и принадлежности: забор железобетонный, линия электропередачи, система водопровода | | 324 480,00 | 3 120,00 |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 26 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 25 июня 2018 г. до 17.00**


■ Прававая гасцёўня

# Начальнік сочыць ці кантралюе?



### Сакрэтнае назіранне за супрацоўнікамі — шлях да турмы

***Наш наймальнік апантаны выкананнем працоўнай дысцыпліны супрацоўнікамі. Паміж маімі калегамі ходзяць чуткі, што ён назірае за намі не толькі праз відэакамеры ў памяшканні, але і сакрэтнымі сродкамі, пра якія мы не ведаем. У тым ліку адсочвае, якія мы наведваем сайты і з кім гаворым па тэлефоне. Калі гэта так, ці мае ён права кантраляваць нас якім заўгодна спосабам?***

**Яніна Ш.**, *г. Мінск*



**На пытанне адказвае Сяргей ЕЛІСЕЕЎ, юрыст-ліцэнзіят:**

— Меркаванне, што начальнік мае права сачыць за супрацоўнікамі любым чынам, — міф. Такіх прывілей у яго няма. Атрымліваць інфармацыю пра падначаленага шляхам назірання за ім з дапамогай пэўных прылад можна толькі, калі чалавек папярэджаны пра гэта і згодны на такія ўмовы працы.

Эканамічныя рэаліі, камерцыйны шпіянаж, выкарыстанне работнікамі сродкаў наймальніка не ў службовых мэтах, сітуацыя на рынку працы і іншыя фактары сапраўды прывялі да таго, што наймальнікі сталі больш патрабавальна ставіцца да супрацоўнікаў. Аднак пры гэтым работадаўцы павінны ўсведамляць, што атрымліваць інфармацыю пра падначаленага сакрэтным чынам недапушчальна і супрацьзаконна.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 года № 307-З «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці» (частка 3 артыкула 11) арганізацыям забараняецца выкарыстанне сродкаў сакрэтнага атрымання (фіксацыі) інфармацыі.

Не дазваляецца атрымліваць пра супрацоўніка інфармацыю, якая фіксуецца з дапамогай прылад, спецыяльна створаных, распрацаваных, запраграмаваных або мадэрнізаваных для сакрэтнага атрымання (фіксацыі) інфармацыі, без паведамлення і згоды на гэта фізічнай асобы, пра якую здабываюцца звесткі. Такімі прыладамі могуць быць тэхнічныя сродкі, абсталяванне, апаратура, прыборы, прыстасаванні, прэпараты, праграмныя прадукты.

Выкарыстанне такіх прылад без паведамлення пра іх наяўнасць супрацоўніку і пры адсутнасці згоды чалавека на іх ужыванне з'яўляецца сакрэтным атрыманнем (фіксацыяй) інфармацыі, што супрацьзаконна.

Сакрэтным атрыманнем будзе лічыцца, напрыклад, усталяванне на працоўным камп'ютары работніка праграмнага забеспячэння, якое дазваляе збіраць інфармацыю пра сайты, якія наведваў чалавек, або вызначаць час працы з пэўнымі файламі і праграмамі, ці праглядаць раздрукаваныя ім дакументы пры ўмове, што супрацоўніка не апавясцілі пра наяўнасць такой праграмы і ён, адпаведна, не пагаджаўся на яе выкарыстанне.

Запісы тэлефонных размоў супрацоўніка ці праз мікрафон камп'ютара, відэазапісы праз вэб-камеру, пра якія чалавек не ведае, таксама лічацца сакрэтным атрыманнем (фіксацыяй) інфармацыі.

Згодна з артыкулам 28 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць. Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь (пункт 8 артыкула 11) таксама замацавана, што супрацоўнікі маюць, у прыватнасці, права на неўмяшанне ў асабістае жыццё і павагу асабістай годнасці.

Абмежаванне правоў і свабод асобы допускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб (артыкул 23) Канстытуцыі. Выкарыстанне сродкаў сакрэтнага атрымання (фіксацыі) інфармацыі дазваляецца толькі спецыяльна ўпаўнаважаным на гэта органам у строга ўстаноўленых заканадаўствам выпадках. Ужыванне такіх сродкаў наймальнікамі да падобных выпадкаў не адносіцца.

Выкарыстанне работадаўцам сродкаў сакрэтнага атрымання (фіксацыі) інфармацыі можа прывесці да ўмяшальня ў асабістае жыццё супрацоўніка, што недапушчальна. З гэтай нагоды наймальніку варта памятаць, што за парушэнне тайны карэспандэнцыі, тэлефонных перамоў, тэлеграфных ці іншых паведамленняў артыкулам 203 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена крымінальная адказнасць.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы***

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 5 (80)



■ Хай-тэк

# НА ВАРЦЕ — ТЭХНАЛОГІІ

## Прадпрыемствы Дзяржкамваенпрама прадставілі свае распрацоўкі на XXV міжнароднай выстаўцы «ТІБО-2018»

**Многія ваенныя распрацоўкі з'яўляюцца стратэгічна важнымі для аховы краіны, і ведаць аб іх магчымасцях павінны толькі спецыялісты. Ахвяраваць цікаўнасцю дзеля бяспекі — разумная цана. Аднак ёсць шэраг іміджавых напрамкаў, якія сведчаць аб тым, што ваенныя і навукоўцы ў тандэме сочаць за сусветнымі трэндамі і гатовыя да супрацьстаяння пагрозам. Так, падчас міжнароднай выстаўкі «ТІБО-2018» у Мінску прадпрыемствы Дзяржкамваенпрама прадставілі свае распрацоўкі ў галіне сувязі, кібербяспекі, абмундзіравання і прыстасаванняў для тэхнікі. Не менш цікавымі былі і распрацоўкі, сярод якіх «разумныя навушнікі» і віртуальны трэнажор для навучання інжынерных войскаў узвядзенню пераправаў цераз рэкі.**




Фота БелТА.

### КІБЕРБЯСПЕКА Ў ТРЭНДЗЕ

Падчас адкрыцця выстаўкі **міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ** адзначыў, што сёлета на «ТІБО» асаблівая ўвага будзе ўдзяляецца кірунку кібербяспекі — абароны інтарэсаў дзяржавы ў віртуальнай прасторы. Многія эксперты і аналітыкі ў галіне ўзбраення сёння сыходзяцца ў меркаванні, што супрацьстаянні XXI стагоддзя могуць перайсці ў віртуальную прастору. Напрыклад, пры нізкай абароненасці хакерскімі атакамі можна вывесці са строю работу сістэмы GPS-навігацыі, тэхніку, выкрасці стратэгічна важную інфармацыю. Таму, па словах міністра, гэты кірунак сёння становіцца трэндам.

Прадпрыемствы Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта прадставілі найноўшыя распрацоўкі па абароне інфармацыі. Кампанія «АГАТ — сістэмы кіравання» прадэманстравала ўнікальную распрацоўку Prima — платформу для крыптаграфічнай абароны інфармацыі — яе шыфравання, з магчымасцю перадачы па адкрытых каналах. Такім чынам інфармацыя можа бяспечна адпраўляцца праз любы від сувязі, але для прыёму патрэбна аналагічная прылада. Спецыяльны крыптаграфічны алгарытм абараняе інфармацыю падчас перадачы.

### СІСТЭМЫ СУВЯЗІ

Таксама на стэндзе «АГАТ» былі станцыі для перадачы і прыёму інфармацыі, якія можна ўсталёўваць, напрыклад, на каманднa-штабную машыну і каардынаваць дзеянні па схаваных каналах сувязі.

Кампанія «Тэхніка сувязі» прадэманстравала бартавую шырокадыяпазонную антэну, якая сумяшчаецца з рознымі тыпамі радыёстанцый і можа быць устаноўлена на любую мабільную бранятэхніку. Распрацоўшчыкі сцвярджаюць, што яна не ствараe кантактных перашкод радыёпрыёму пры руху тэхнікі.

Іншая ўнікальная антэна АШ-4 таксама можа быць устаноўлена на ваенную тэхніку, аднак яе адметнай рысай з'яўляецца работа ў экстрэмальных атмасферных умовах. Яна здольная забяспечваць сувязь пры тэмпературах ад +50 да -50 градусаў пры атмасферных ападках, запыленасці і пырсках.

Не менш цікавая і партатыўная аварыйна-выратавальная радыёстанцыя Р-855А1, здольная падтрымліваць двухбаковую сувязь паміж членамі экіпажа паветранага судна ў выпадку, калі яно пацярпела аварыю. Такая радыёстанцыя дапаможа экіпажу звязацца з пошукава-выратавальнай групай і прывесці яе да патрэбнага месца. У прылады ёсць два рэжымы — «сувязь» і «маяк». У першым яна ператвараецца ў радыётэлефон, у другім — перадае сігнал бедства ў адпаведнасці з міжнароднымі нормамі ICAO. Яна таксама здольная вытрымліваць экстрэмальныя кліматычныя ўмовы: працуе пры тэмпературы ад -50 да +60 градусаў і адноснай вільготнасці паветра да 90 %.

### «РАЗУМНЫЯ НАВУШНІКІ»

Тактычная абстаноўка на полі бою пастаянна змяняецца: цішыня можа рэзка выбухнуць кананадай артылерыйскіх залпаў або стралянінай. На «ТІБО» прадставілі беларускія «разумныя навушнікі», якія могуць адсякаць рэзкія шумы, здольныя пашкодзіць здароўе салдата. Гарнітура ГСШ-01 мае так званую гукавую пастку, якая дазваляе змяншаць шумы звыш за 115 дБ. Актыўныя навушнікі працуюць пры тэмпературах ад -30 да +55 градусаў, працаздольныя ва ўмовах інею і расы. Сілкуюцца ад батарэйкі тыпу AAA і могуць бесперапынна працаваць на працягу 72 гадзін.



### ВІРТУАЛЬНЫЯ МАСТЫ

На ваенным факультэце БНТУ распрацавалі трэнажор, які дазваляе віртуальна навучаць узвядзенню мастоў цераз водную перашкоду. Аўтарская распрацоўка ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ з'яўляецца праграмай-сімулятарам, якая дазваляе кіраваць машынай УБМ-2, што прызначана для будаўніцтва нізкаводных мастоў з гатовых элементаў канструкцыі. Гэтая машына стаіць сёння на ўзбраенні ў Беларусі. Праграма дазваляе курсанту паэтапна ўдзельнічаць у працэсе ўзвядзення моста, а кіраванне нагадвае гульню ў танкі, што палягчае засваенне. Таксама ўсе наведвальнікі стэнда ваеннага факультэта БНТУ маглі папрактыкавацца ў віртуальнай стральбе з трэніровачнага АК-74 і пісталета Макарава.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Падрабязнасці

# СУСТРЭЛІ ДЭЛЕГАЦЫЮ НАТА

**Дэлегацыя штаб-кватэры НАТА на гэтым тыдні наведала Беларусь. Прайшла штогадовая нарада па пытаннях удзелу Беларусі ў працэсе планавання і ацэнкі сіл праграмы НАТА «Партнёрства дзеля міру».**

Падчас яе адбылося ўзгадненне новага пакета мэт партнёрства, там абмяркавалі шэраг практычных пытанняў, а таксама адзначылі шляхі па ўзаемадзеянні паміж Міністэрствам абароны і структурнымі падраздзяленнямі альянсу ў межах працэсу планавання і ацэнкі сіл.

З беларускага боку ў нарадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі структурных падраздзяленняў Міністэрства абароны, Генеральнага штаба Узброеных Сіл і Узброеных Сіл, якія адказваюць за рэалізацыю мэт. У склад дэлегацыі НАТА ўвайшлі прадстаўнікі Міжнароднага сакратарыята і кіраўніцтва ваеннага партнёрства НАТА, аташэ па пытаннях абароны пры пасольстве Федэратыўнай Рэспублікі Германія, Літоўскай Рэспублікі, Рэспублікі Польшча і Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама прадстаўнік пасольства Эстонскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, які выконвае функцыі кантактнага пасольства НАТА.

Вынікам нарады стала сустрэча начальніка дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочніка міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва генерал-маёра Алега Воінава з кіраўніком дэлегацыі Полам Савера, у ходзе якой бакі абмеркавалі стан і перспектыўныя кірункі развіцця супрацоўніцтва ў ваеннай сферы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# У яблычак!

## Найлепшую снайперскую пару вызначылі пад Брэстам

**На палігоне Брэсцкі 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады скончыліся міжнародныя спаборніцтвы на самую лепшую снайперскую пару спецыяльнага прызначэння Узброеных Сіл. Найбольш дакладных стралкоў вызначалі ў індывідуальным і парным заліках.**



Фота БелТА.

— Да нас сёлета прыехалі на іспыт 27 снайперскіх пар, — зазначыў **старшы суддзя спаборніцтваў Вадзім ГРЫЦУК**. — Сярод іх — тры з Расійскай Федэрацыі. Прыемна адзначыць, што найлепшымі былі прызнаны ваеннаслужачыя сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі. Таксама ў ліку канкурсантаў — байцы спецыяльнага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», спецыяльнага атрада хуткага рэагавання ўнутраных войскаў, спецпадраздзялення памежных войскаў і рэгіянальных атрадаў міліцыі.

Снайперы стралялі з розных відаў зброі, прызнаных аднымі з найлепшых у свеце — расійскай, фінскай і нямецкай вытворчасці.

# «Супрацьстаянне» на палігоне Ласвіда

**Аднайменная ваенна-спартыўная патрыятычная гульня праходзіць у гэтыя дні пад Віцебскам на палігоне 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады. Яе ўдзельнікі правяраюць свае веды і ўменні па агнявой падрыхтоўцы, спаборнічаюць у зборцы і разборцы зброі, пераадольваюць паласу разведчыка. Таксама ў праграме гульні — комплексныя сілавыя практыкаванні, армрэслінг і перацягванне каната.**

Але найбольш відовішчным стане марш-кідок па перасечанай мясцовасці з арыентаваннем на мясцовасці, падчас якога будуць эвакуяваны ўмоўна «параненыя» і пераадолена водная перашкода.

Год ад году расце і колькасць удзельнікаў «Супрацьстаяння», якое праводзіцца сёлета чацвёрты раз. Напрыклад, сёлета на палігон Ласвіда прыехалі 250 чалавек. Яны склалі 11 дружын з розных арганізацый па ўсёй краіне.

— Гульня скіравана на выхаванне патрыятызму, каманднага духу, любові да спорту і стварэнне станоўчага іміджу Узброеных Сіл, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны. — «Супрацьстаянне» — добрая магчымасць для ўдзельнікаў паказаць свае веды і ўменні, творчыя здольнасці, з'яднаць калектывы, а таксама абмяняцца вопытам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Начны бой і экскурсіі для ўсіх

## Чым здзівіць «Лінія Сталіна» ў ноч музеяў

**Сёння ў гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна» пры падтрымцы Міністэрства абароны пройдзе «Ноч музеяў — 2018». Мерапрыемства прымеркавана да Міжнароднага дня музеяў.**

На працягу дня і да ночы для наведвальнікаў комплексу будуць працаваць экскурсійныя і забаўляльныя зоны. Будзе прадэманстравана рэканструкцыя начнога бою афганскай вайны з удзелам гурта ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Шураві» і ваенна-гістарычнага клуба «Салдаты Перамогі». Як заўсёды, кожны наведвальнік «Лініі Сталіна» знойдзе сабе занятак па душы — па-за залежнасцю ад узросту. Самых актыўных чакаюць падарункі і сувеніры. У рамках міжнароднай акцыі білеты на наведванне комплексу будуць па спецыяльнай цане са зніжкай.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# МАЦІ ПЕРАЖЫВАЮЦЬ, БАЦЬКІ ГАНАРАЦЦА

## Больш за 10 тысяч прызыўнікоў папоўняць беларускую армію



**Менавіта такая колькасць людзей будзе накіравана ў шэрагі айчынных вайсковых падраздзяленняў, паведаміў начальнік галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення, намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Аляксандр ШКІРЭНКА.**

«Прызыў на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве ў першую чаргу забяспечвае грамадзянам нашай краіны выкананне іх канстытуцыйнага абавязку — абароны Беларусі, — адзначыў ён. — Моцных асаблівасцяў няма, прызыў праходзіць як звычайна ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам. Выкліку на прызыўныя камісіі вясной гэтага года падлягае каля 45 тысяч чалавек».

Начальнік галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення звярнуў увагу на тое, што медыцынскае абследаванне новага папаўнення завяршаецца. «Прызыўной камісіяй ужо прынята больш за 30 тысяч рашэнняў, па іх больш за 20 тысячам прызыўнікоў дадзена адтэрміноўка, найбольшая з якіх — для працягу адукацыі», — сказаў ён. Акрамя таго, адтэрміноўкі дадзены па стане здароўя, сямейным становішчы, а таксама ў сувязі з ажыццяўленнем дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Такім чынам, службовыя асобы ваенных камісарыятаў і вайсковых часцей завяршылі планавую работу па адборы прызыўнікоў для камплектавання воінскіх часцей Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў. З 15 мая з Мінскага гарадскога зборнага пункта і зборных пунктаў усіх абласцей пачалася адпраўка новага папаўнення ў войска.

«Зыходзячы з патрэб, на ўкамплектаванне Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў плануецца накіраваць да 10 тысяч чалавек, у гэты ж перыяд да 500 чалавек будзе накіравана на службу ў рэзерве, — дадаў Аляксандр Шкірэнка. — Новае папаўненне будзе накіравана на ўкамплектаванне Узброеных Сіл, транспартных войскаў, унутраных войскаў МУС, органаў пагранічнай службы і КДБ».



Фота Дзяніса МАЛЬШЫЦА.

У першы дзень у войска было накіравана каля тысячы прызыўнікоў. Урачыстыя цырымоніі адпраўкі грамадзян Мінскага рэгіёна прайшлі на базе сталічнага гарадскога зборнага пункта і мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». У іх прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства абароны, Мінаблвыканкама, адміністрацыі сталіцы, грамадскіх аб'яднанняў, ветэраны, родныя і сябры прызыўнікоў.

Дарэчы, адпраўка новага папаўнення ў злучэнні з абласных зборных пунктаў краіны працягнецца па 31 мая. Цырымонія ваеннай прысягі адбудзецца 16 чэрвеня. Акрамя таго, на працягу гэтага месяца будзе праведзена звальненне ў запас тых ваеннаслужачых, якія выслужылі ўстаноўлены перыяд тэрміновай ваеннай службы.

...На базе сталічнага зборнага пункта на вуліцы Ангарскай было спакойна — родныя і блізкія будучых абаронцаў размясціліся ў альтанках і цёпла развіталіся з прызыўнікамі. Для Мікіты Стахіевіча служба была маленькай марай, якая паспяхова пачала рэалізоўвацца. «Дзякуючы здароўю, дзякуючы жаданню я іду служыць у Мар'іну Горку на паўтара года», — расказаў хлопец.

Бацька маладога чалавека Уладзімір узрадаваўся, што сын трапіў у элітнае падраздзяленне. «Трэба ісці, каб для сябе зразумець, што такое ваенная служба, як трэба служыць і абараняць сваю Радзіму, — адзначыў ён. — А мы з жонкай будзем чакаць яго дома і спадзявацца, што ўсё будзе добра. Пакуль такія бравыя хлопцы, як мой сын, будуць служыць, мы будзем спакойна і мірна спаць».

Дзмітрый Ромац даўно марыў звязаць сваё жыццё з войскам. «Я хачу застацца па кантракце першапачаткова менавіта ў той жа часці (5-й асобнай брыгадзе), — сказаў малады чалавек. — Так што я вельмі рады, што трапіў сюды».

Энтузіязм хлопца падзяляюць і яго бацькі. «Я вельмі рады і задаволены, — адзначыў бацька Дзмітрыя Віктар. — Вядома, я таксама служыў, але вельмі даўно. Якія настаўленні даў сыну? Служыць, абараняць, каб мы ганарыліся ім, каб не падвёў і каб усё было добра».

■ Лад жыцця

# І падмурак, і дужы тыл

## Найлепшую маладую сям'ю года Узброеных Сіл выбралі ў Мінску

**Заключны этап штогадовага конкурсу «Сям'я — крышталь грамадства» адбыўся ў Цэнтральным доме афіцэраў. Мэтай яго правядзення арганізатары называюць фарміраванне ў маладых ваеннаслужачых якасцяў, якія сёння неабходны для развіцця і ўмацавання сямейных адносін, грамадзянскай адказнасці, прапаганды здаровага ладу жыцця, а таксама разумення членамі сем'яў важнасці задач, якія выконваюць вайскоўцы.**



### НАЙМАЦНЕЙШЫЯ І САМЫЯ КРЭАТЫЎНЫЯ



— Конкурс традыцыйна праводзіцца напярэдадні Дня сям'і, які прапагандуе такія непарушныя каштоўнасці ў нашым грамадстве, як любоў, павага, паразуменне, — заўважыў **выконваючы абавязкі першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі палкоўнік Фёдар ЯФІМЕНКА.** — Сям'я — гэта аснова, падмурак грамадства, а таксама дужы тыл чалавека ў пагонах.

Фёдар Яфіменка звярнуў увагу, што для паспяховага пападання ў фінальную частку выпрабаванняў удзельнікі пераадолелі некалькі фаз. «Конкурс праводзіцца ў тры этапы. Першы адбыўся непасрэдна ў войсках, другі — у адпаведных камандаваннях», — адзначыў ён.

Дарэчы, у фінале ўдзельнікі павінны былі пераадолець тры выпрабаванні. Першае — візітная картка. У гэтым раўндзе вайскоўцам трэба было расказаць гісторыю сваёй сям'і. Другі этап атрымаў паэтычную назву «Мой родны кут, як ты мне мілы...», у ім удзельнікі закранулі тэму малой радзімы, расказалі пра свае родныя гарады, тым больш што ў гэтым годзе геаграфія конкурсу была вельмі шырокай. Выніковым змаганнем стаў творчы конкурс, ацаніць які, несумненна, было складаней за ўсё, бо кожная сям'я магла паказаць свае здольнасці ў вольнай форме.

### БАГАТЫЯ НА ТАЛЕНТЫ

Такім чынам, у гэтым годзе перад гледачамі і журы паўсталі шэсць сем'яў вайскоўцаў: старшага лейтэнанта Сяргея Цеплякова (49-я радыётэхнічная брыгада Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны), старшага лейтэнанта Алега Лютарэвіча (72-гі гвардзейскі аб'яднаны вучэбны цэнтр падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў), капітана Уладзіміра Кавалевіча (231-я артылерыйская брыгада Паўночна-заходняга камандавання), старшага лейтэнанта Ігара Казекі (5-я асобная брыгада спецыяльнага прызначэння сіл спецыяльных аперацый), старшага сяржанта Яўгена Карэйвы (557-я інжынерная брыгада Заходняга аператыўнага камандавання) і капітана Максіма Сазанчука (56-ы асобны полк сувязі Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны).

У кулуарах фінальнага выпрабавання старшы сяржант Яўген Карэйва расказаў, што на ўдзел у конкурсе яго падштурхнуў патрыятызм. «Акрамя таго, гэта цікава і для сям'і гэта навіна, — адзначыў ён. — Тым больш калі Узброеныя Сілы даюць такую магчымасць, то чаму б ёй не скарыстацца? Рыхтавацца да конкурсу было цяжка, але калі вельмі моцна чагосьці хочаш, то гэтага можна дасягнуць. Дарэчы, з кожным этапам мы спрабавалі ўдасканальваць нашы выступленні. Мы (Яўген і яго жонка Іна. — **Аўт.**) — творчыя людзі, адвучыліся ў Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў». Падрыхтоўка да фінальных выпрабаванняў заняла ў сям'і Карэйваў больш за месяц, практычна праз дзень маладыя людзі працавалі над сцэнарыямі нумароў — зыходзячы з гэтага, можна ўявіць, наколькі і яскравае выступленне яны прадэманстравалі ў Цэнтральным доме афіцэраў. Дарэчы, гэта датычыцца ўсіх фіналістаў — нумары былі вельмі прыгожыя, а ўдзельнікі не пакազвалі нават намёку на хваляванне перад публікай (хоць яно дакладна прысутнічала).



У першым конкурсе кожная сям'я прадэманстравала невялікі фільм пра сябе, далучыўшы да яго цёплую гісторыю пра кожнага з членаў сям'і, а таксама найбольш важныя ўспаміны. Удзельнікі сапраўды творча падышлі да працэсу падрыхтоўкі — напрыклад, сям'я Ігара Казекі разыграла на сцэне тэатр ценяў, а старшы лейтэнант Лютарэвіч разам з жонкай напісаў сапраўдную п'есу.

У другім конкурсе кожная сям'я з вялікай любоўю і гонарам расказала аб родных мясцінах. І тут не абышлося без відэазамалёвак, на якіх гледачы і журы змаглі ўбачыць гарады ўдзельнікаў, таксама ў гэтым раўндзе фіналісты расказалі легенды, спявалі і танцавалі.

У трэцім конкурсе сем'і паказалі сябе па-свойму — Лютарэвічы гралі на музычных інструментах, Кавалевічы прысвяцілі выступленне спорту, а Сазанчукі — танцу.

### АДКУЛЬ ПЕРАМОЖЦЫ?

Журы ацэньвала не толькі форму і спосаб падачы інфармацыі, але і паўнату раскрыцця тэмы, творчыя здольнасці мужа і жонкі, уменне паднесці матэрыял. Акрамя таго, звярталі ўвагу і на ўдзел кожнага з сям'і пры падрыхтоўцы выступлення, а таксама на сацыяльную значнасць творчых нумароў.

Пераможцам конкурсу «Сям'я — крышталь грамадства» стала сям'я старшага лейтэнанта Цеплякова з Пастаў. Другое месца заняла пара Лютарэвічаў з Барысава, а трэцяе дасталася сям'і Сазанчукоў з Мінска. Усе фіналісты атрымалі ад арганізатараў, якімі выступілі Міністэрства абароны Беларусі і Цэнтральны камітэт грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», памятныя дыпломы, а пераможцы — каштоўныя падарункі.

**Матэрыялы падрыхтаваў Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** изолированное помещение, инв. № 400/D-5569 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 165,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Лермонтова, 8

Начальная цена продажи – 83 819,52 руб. (восемьдесят три тысячи восемьсот девятнадцать рублей пятьдесят две копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 8 382 руб. (восемь тысяч триста восемьдесят два рубля)

Продавец – Гродненский городской филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона:
– расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на покупателя;
– право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
– документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 6 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещает участников аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 20.03.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 1 июня 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднорайагросервис», расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра 19 июня 2018 года

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 3 капитальных строения (административное здание, кафе-бар, здание гостиницы), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, асфальтобетонное покрытие, ограждения |
| Начальная цена продажи | **420 845,80 рублей** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 422086003101000107 площадью 0,2674 га и 422086003101000108 площадью 0,5114 га |
| Месторасположение земельных участков | **Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Гроднорайагросервис», г. Гродно, ул. Понемуньская, 27, тел. 8 (0152) 755568** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | **42 084,58 рублей** |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 720537, 720546. |
| Дата проведения аукциона | **19 июня 2018 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 21 мая 2018 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 13 июня 2018 года 16.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг "Гродненский центр недвижимости", **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

**УП «Белконфискат» объявляет о проведении электронных торгов 04.07.2018 г. по продаже имущества, зарегистрированного за Коледа С. И.**

Легковой хэтчбек «Мазда 2», МКПП, 2011 г. в., бензин, Кузов: JMZDE145200444433 начальной стоимостью 10 800 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 226-94-89, 8 (029) 779-08-09.

УНП 190431606

## Паритетбанк

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а) сообщает, что 23 мая 2018 г. в 16.00 в соответствии с решением наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк» состоится внеочередное общее собрание акционеров в очной форме по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, зал заседаний, 3-й этаж**

**Повестка дня:**
1. Об избрании наблюдательного совета.
2. Об избрании ревизионной комиссии.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 21 мая 2018 г.
Лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться с информацией (документами) по вопросам повестки дня 22 мая 2018 г. с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, каб. 306, а также 23 мая 2018 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров при прохождении регистрации.
Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет проводиться 23 мая 2018 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров с 15.20 до 15.50 при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).
Телефон для справок: 237 76 79.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27 октября 2014 №5. УНП 100233809

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 411/С-13813 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 191,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 420455100001001167, (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина)), площадью 0,1022 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58

Начальная цена продажи – 19 248 руб. (девятнадцать тысяч двести сорок восемь рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 925 руб. (одна тысяча девятьсот двадцать пять рублей)

**ЛОТ 2:** капитальное строение, инв. № 411/С-15726 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака 2 25 01, наименование – квасильно-засолочный цех), площадью 80,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А и сооружение, инв. № 411/С-15762 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – наружная сеть канализации), протяженностью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001330, (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания здания квасильно-засолочного цеха)), площадью 0,0517 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А

Начальная цена продажи – 12 264 руб. (двенадцать тысяч двести шестьдесят четыре рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 226 руб. (одна тысяча двести двадцать шесть рублей)

**ЛОТ 3:** капитальное строение, инв. № 411/U-15063 (назначение – здание неустановленного назначения 2 99 99, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу Берестовицкий р-н, д. Вороны, ул. Озерная, 2а

Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420484001101000043, (назначение – для строительства и обслуживания здания цеха минеральной воды), площадью 0,6620 га, расположенном по адресу: Берестовицкий р-н, д. Вороны, ул. Озерная, 2а. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земли, находящейся в водоохранных зонах водных объектов, код – 4.1, площадью 0,6620 га

Начальная цена продажи – 31 200 руб. (тридцать одна тысяча двести рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 120 руб. (три тысячи сто двадцать рублей)

Продавец – Берестовицкий филиал Гродненского областного потребительского общества 231778, г. п. Берестовица, ул. Советская, 2

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона - аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 7 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещает участников аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 24.02.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 4 июня 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает о снятии с аукционных торгов 22.05.2018 года: Лот № 1 – кап. строение с инв. № 201/С-13039, пл. 43,8 кв. м, по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, д.Улишицы, ул. Северная, д. 8. Лот № 7 – кап. строение с инв. № 710/С-65839, по адресу Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Днепровской Флотилии, 13/415. Лот № 8 – кап. строение с инв. № 710/С-10661 по адресу Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Жуковского, д. 92. Конт. тел. (0212) 47-20-56.

УНП 390477566

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»**

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 712/С-22741 – Станция технического обслуживания,** расположенное по адресу: Могилевская обл, г. Кировск, ул. Гагарина, 18, площадь – 412,3 кв. м;
**Капитальное строение с инв. № 712/С-23122 – Мастерские,** расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кировск, ул. Гагарина, 18А, площадь – 727,2 кв. м с входящим в его состав: асфальтобетонным покрытием площадью 4533,4 кв. м; забором кирпичным длиной 48,6 м; забором металлическим длиной 71,2 м.
**Капитальное строение с инв. № 712/С-21944 – Столярный цех,** расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кировск, ул. Гагарина, 18, площадь – 55,4 кв. м.
**Капитальное строение с инв. № 712/С-23123 – Котельная,** расположенное по адресу: Могилевская обл, г. Кировск, ул. Гагарина, 18, площадь – 203,9 кв. м.
Сведения о земельном участке: здания расположены на земельном участке с кадастровым номером 722550100001003216 (право постоянного пользования), площадью – 0,9256 га, назначение: земельный участок для обслуживания зданий и сооружений (для размещения объектов иного назначения), расположен по адресу: Могилевская обл., Кировский р-н, г. Кировск, ул. Гагарина, 18.
***Начальная цена продажи – 101 880,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 10 188,00 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 19 июня 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 18 июня 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которую подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.
**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (+375 222) 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 29 738-18-99**

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

**Верхняе Чэрніхава Баранавіцкага раёна**

# «І ПРЫ ПАНАХ, І ПРЫ САВЕТАХ ДОБРЫ РАБОТНІК БЫЎ У ЦАНЕ»



Капліца на ўездзе.

**Ветэран вайны, былы саўгасны трактарыст зіму правёў у сына ў горадзе. А летам ізноў пацягнула ў родную хату. Дзядуля сам даглядае невялікі агарод і немалы кветнік, спраўляецца са сваёй няхітрай хатняй гаспадаркай. «Мая гаспадынька любіла кветкі, — расказвае. — Вось я цяпер іх не пакідаю, хоць ужо пяць гадоў адзін...» Філарэт ЯНУЦЬ адзін з нямногіх жыхароў Верхняга Чэрніхава. Зарэгістравана ў вёсцы дзевяць чалавек, але пражывае яшчэ менш... А мясціны тут, мала сказаць, прыгажэнныя. Старшыня сельскага Савета Наталля Ібрагімава папярэджвала, у гэтай вёсцы аўра нейкая асаблівая, як ступаеш нагой — адчуваеш супакаенне, раскошу. Можа, іх ствараюць старыя высокія ліпы, што засталіся ад панскага фальварка? Апошніх гаспадароў сядзібы памятае наш герой.**

З кнігі Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» можна даведацца, што фальваркам Горны Чэрніхаў, так ён раней называўся, з XVII стагоддзя валодалі Рдултоўскія. Яны займалі ганаровыя пасады, удзельнічалі ў рабоце соймаў, карысталіся каралеўскімі прывілеямі. Адзін з гаспадароў сядзібы — Казімір Рдултоўскі — быў праўнукам князя Радзівіла Рыбанькі. Яго сенсацыйны шлюб з дачкой бацькі ад другой жонкі нарабіў шуму па ўсёй ваколіцы, але кар'еры навагрудскага маршалка не перашкодзіў. А вось апошнім уладальнікам фальварка стаў Канстанцін Рдултоўскі (1880—1953), выпускнік Варшаўскага політэхнічнага інстытута, павятовы камісар, павятовы староста ў Баранавічах. У 1939 годзе ён быў арыштаваны і высланы ў Караганду. Пасля вызвалення жыў у Іране, Англіі, дзе і памёр. Ёсць таксама звесткі аб тым, што яго жонка Соф'я Хрыстофа, балгарка па нацыянальнасці, у вайну трапіла ў лагер Асвенцым, пасля вызвалення жыла ў Еўропе.

Паноў Філарэт Рыгоравіч згадвае добрым словам, кажа, што вельмі цанілі яны тых, хто старанна працаваў, а гультаёў не любілі. Паводле яго слоў, усёй гаспадаркай запраўляла пані, бо пан быў вечна заняты справамі службы і грамады. І бацькі, і дзяды нашага героя жылі пры фальварку. У дзеда было шмат дзяцей, жылі, вядома, беднавата. Бо тады заможным лічыўся той, хто меў шмат зямлі. Кожнаму сыну трэба было даць надзел, а дачцэ ў пасаг таксама — не меншы за гектар. Без гектара зямлі шанцы на замужжа істотна памяншаліся. Бацька Філарэта Рыгор працаваў на панскай гаспадарцы, а маці служыла пакаёўкай. Вось яны і пабраліся шлюбам, не зглядаючыся на пасаг і агульную колькасць зямлі, хоць і не ведалі, што хутка гэта не будзе мець значэння. Падлеткам Філарэт таксама падпрацоўваў у пана. Расказваў, як яму, 13-гадоваму, даверылі адказную місію: ён падводай вазіў панскую дачку, на два гады старэйшую за яго, у школу. За гэтую паслугу атрымліваў кожны раз 50 грошаў, па тым часе нядрэнны заробак. Можна было купіць нешта з прадуктаў альбо якіх ласункаў. Ну а потым, як вядома, усё памянялася, а потым наогул — вайна.

Пасля вызвалення Беларусі ў 1944-м яго, 18-гадовага, забралі на фронт.

— Такіх, як я, — згадвае ветэран, — накіроўвалі на вучобу, тры месяцы нас вучылі, потым адправілі на другую лінію фронту. Я так разумею, не хацелі адразу кідаць на перадавую, бо ад нас там, вядома рэч, нічога не засталося б. Але к канцу вайны мы ўжо былі абстралянымі байцамі... Адным словам, усю Еўропу прайшоў і дайшоў да Берліна. Потым нас перакінулі на кітайскі напрамак служыць далей. Вярнуўся дадому ў 1951 годзе.

— У мяне была добрая характарыстыка пасля службы, — працягвае Філарэт Рыгоравіч. — І вось начальнік раённай міліцыі, помню як цяпер яго прозвішча Пагадаеў, вельмі ўгаворваў мяне пайсці ў органы працаваць. Тады, праўда, у нас Гарадзішчанскі раён быў, а не Баранавіцкі... Я ўсяляк адмаўляўся, казаў, што не дужа пісьменны: я ж усяго два класы пры Польшчы скончыў. А ён не згаджаўся, казаў, што пашлюць мяне вучыцца завочна, а я каштоўны для іх кадр, бо зброю знаю, карыстацца ёю ўмею. А мне тая зброя, ведаеце, як за сем гадоў надакучыла! Я не воін па натуры, я больш люблю на зямлі працаваць. Адным словам, катэгарычна не пагадзіўся і прыйшоў у калгас, які толькі што арганізавалі, на агульныя работы. Спачатку аралі і сеялі — усё коньмі рабілі, вось я і займаўся гэтым. Потым паставілі брыгадзірам, а калі два калгасы аб'ядналі, нават кіраўніком падраздзялення. Пабыў тры гады на гэтай пасадзе, з часам сталі прыходзіць маладыя з адукацыяй, мяне зноў паставілі брыгадзірам. Так я адпрацаваў 16 гадоў. А потым пайшоў на курсы трактарыстаў, здаў на правы і перайшоў працаваць на трактар. Летам заўсёды перасаджваўся на камбайн, гэту работу люблю, гэта была мая работа. І мяне заўважалі, нават у Маскву на ВДНГ адзін раз ездзіў. Зарабіў добрую пенсію, вось такое маё жыццё, — заключае ветэран.



Філарэт ЯНУЦЬ.

Філарэт Януць з жонкай выгадавалі траіх дзяцей. Праўда, перажылі вялікае гора, адзін сын трагічна загінуў зусім маладым. Цяпер сын і дачка жывуць у Баранавічах. Вядома, клічуць да сябе бацьку.

А дом у ветэрана дыхтоўны, што гаворыць пра ўмельства яго гаспадара. У пакоях прыбрана і дагледжана, нібы тут кожны дзень шчыруе гаспадыня. Апошняе ўжо, відаць, заслуга дзяцей і ўнукаў.

Сталы чалавек расказвае, што сядзець на лаўцы ды сумаваць яму не даводзіцца. Днём ён стараецца папрацаваць на агародзе, вечарам уключае тэлевізар, але глядзіць толькі выпуск навін. Ды і сучасныя фільмы, перадачы, мякка кажучы, не на яго густ. А вось радыё працуе цэлы дзень, так нават весялей у хаце. Два разы на тыдзень прыходзіць аўтакрама, раней заходзіла нават тры разы, але самі нешматлікія жыхары Верхняга Чэрніхава адмовіліся, сказалі, што ім хопіць і двух прыездаў. «Што там нам купляць? Малака, хлеба ды ўсяго іншага набяром, ва ўсіх жа халадзільнікі ёсць. Чаго там машыну лішні раз ганяць», — разважае ён па-гаспадарску.

— Некалі жылі бедна, але былі адкрытыя душой адно да аднаго, і ў бядзе, і ў радасці разам, нават суседзі. А цяпер, глядзіце, вось я ў сына зімой жыву, у яго свой дом, суседзі на вуліцы павіталіся, перакінуліся словам, нават пенсіянеры, нічым не занятыя, і разышліся па сваіх вуглах. Няма паняцця, каб зайсці адно да аднаго, пагаварыць. Я лічу так: чым больш забяспечаным становіцца чалавек, чым багацей ён жыве, тым ён горшы. Можа, вы так не лічыце, але вы не ведаеце, якія раней былі людзі... І мяне гэта вельмі хвалюе, — разважае ветэран.

Сам жа Філарэт Рыгоравіч вельмі любіць гасцей. Расказвае, што гады два таму нейкія сталічныя журналісты хадзілі па ваколіцы, спрабавалі адшукаць рэшткі панскай сядзібы. Тут захаваліся ліпавая алея, разваленая капліца-ўсыпальня роду Рдултоўскіх. Апошнюю, праўда, даўно разрабавалі вандалы. Засталіся яшчэ вадаёмы і невялічкая капліца пры ўездзе. Дарэчы, на здымку 1987 года ў кнізе Федарука яна выглядае вельмі занядбанай, а цяпер адрамантавана, мае выгляд даволі прывабны. Дык вось, Філарэт Рыгоравіч запрасіў дадому тых падарожнікаў, пачаставаў, расказаў, што помніць пра мінулае вёскі, якую раней так прыгожа называлі Горны Чэрніхаў. Ён і нас вельмі запрашаў застацца, пасядзець, пагаманіць. Мы прыехалі да ветэрана са старшынёй сельскага Савета Наталляй Ібрагімавай і старшынёй раённага Савета Сяргеем Слівай. І вельмі пашкадавалі, што дзень быў шчыльна распісаны і прызначаны яшчэ сустрэчы. Да такіх людзей трэба прыходзіць не зважаючы на гадзіннік.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

# ЦЯЖКІЯ ТЫЯ, КАМУ ЦЯЖКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Калі б не гэтая ўстанова, не ведаю, кім бы я стаў. Ужываў алкаголь, пачаў нюхаць розныя хімічныя рэчывы, прапускаць урокі ў школе, неаднаразова ўсчыналі бойкі. У гэтай установе я ўжо год і дзевяць месяцаў. Шчыра кажучы, рады, што сюды трапіў. Менавіта тут далі сілы да далейшага жыцця. Тут пазнаёміўся з многімі людзьмі, зразумеў, што рабіў не так, як трэба, — неяк па даросламу кажа Вова.

— Я таксама ўжываў алкаголь, наркотыкі. Выхавацелі, педагогі, псіхолагі, спецыялісты дапамагаюць мне паверыць у свае сілы і стаць на ногі. Вядома, ніхто не дапаможа, калі сам не захочаш і не прыкладзеш намаганні. Тут можна таксама па жаданні набыць спецыяльнасць, якая дасць магчымасць у далейшым зарабляць на жыццё. Хочаш быць будаўніком — калі ласка. А некаму даспадобы рамантаваць аўтамабілі, займацца агародніцтвам, — лічыць Андрэй.

Вядома, спецвучылішча — гэта не дзіцячая калонія. Яно ўваходзіць у сістэму Міністэрства адукацыі Беларусі. Цяжкія падлеткі, па сутнасці, не з'яўляюцца злачынцамі. Судзімасць пасля выхаду з установы пагашаецца незалежна ад катэгорыі парушэння. Але рэжым дня тут строгі, як у арміі. Пад'ём, гігіенічныя працэдуры, прыбіранне пасцеляў, спальных пакояў, сняданак, вучоба ў школе, заняткі ў вытворчых майстэрнях, вольны час, адбой.



Фота Анатоля БАСАВА.

**Выхаванцы вучылішча не толькі вучацца, працуюць, але і змястоўна адпачываюць.**

— Дзеці атрымліваюць у нас звычайную адукацыю. Толькі для выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця распрацаваны спецыяльныя вучэбныя праграмы. Для гэтай катэгорыі гадаванцаў восенню і зімой адкрываем кароткачасовы курс фізічнага развіцця, дзе іх вучаць вырошчваць агародніну, садавіну, даглядаць за свойскай жывёлай. А навучэнцы з каледжаў, ліцэяў набываюць яшчэ і прафесіі маляра-тынкоўшчыка, абліцоўшчыка-плітачніка і слесара па рамонце аўтамабіляў, — расказала **намеснік дырэктара Марына РАКЕЦКАЯ.**

У вучэльні ўладкаваны гаспадарчы двор, дзе ўтрымліваецца розная жыўнасць: куры, парсюкі, коні. Ёсць свае пасека, цяпліцы, сад. Прадукцыя выкарыстоўваецца ва ўласнай сталоўцы, што дазваляе разнастаіць меню вітамінамі і крыху эканоміць кошт харчавання. Ва ўстанове яно пяціразовае.

— Цяжка працаваць з такімі падлеткамі? — пацікавілася ў Марыны Францаўны.

— У гэтых хлопчыкаў іншае мысленне, чым у іх равеснікаў. Яны вельмі запушчаныя ў плане сацыяльнай адаптацыі. Вядома, могуць змахляваць, апраўдваючы свае ўчынкі, выкручвацца з сітуацыі, схітрыць.

Мабыць, ім не хапае чалавечых стасункаў, хатняй цеплыні, дарослага сябра, які б параіў выхад з цяжкай сітуацыі, падказаў, дапамог, лічыць спецыяліст

— Да нас прывезлі падлетка, які выпіў піва, трапіў на вочы ўчастковаму інспектару міліцыі. У выніку — штраф. Сеў за руль матацыкла — спынілі супрацоўнікі ДАІ. Ага, нападпітку за рулём, няма тэхагляду. Словам, за дзень некалькі парушэнняў. Паступіў падлетак у дэпрэсіўным стане. Але да яго знайшлі падыход, прапанавалі папрацаваць на гаспадарчым двары. Так, вяскоўага хлопца вывелі з дэпрэсіі, — успамінае **педагог-псіхолаг Анатоль КРАСНЕВІЧ.**

Летась чацвёра хлопцаў паступілі ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Ім далі магчымасць пад наглядам сацыяльных педагогаў з'ездзіць у каледжы, здаць дакументы і прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне. Затым падалі ў суд неабходныя дакументы аб датэрміновым вызваленні абітурыентаў, паколькі яны добра сябе паводзілі.

Падлеткі ведаюць, што парушыць правілы прыжывання, дысцыпліну — значыць, пазбавіцца маленькіх радасцяў. Напрыклад, сустрэчы з бацькамі або магчымасці паехаць на канікулы да двух тыдняў дадому.

— На працягу двух гадоў мы адсочваем далейшы лёс былых выхаванцаў, дапамагаем уладкавацца на работу, — расказвае дырэктар Андрэй Дубаневіч. — Звязваемся з органамі ўлады, установамі адукацыі, цікавімся, чым займаюцца, як сябе паводзяць.

І пра многіх чуюць толькі добрыя водгукі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**❍ У тэму**

Не так даўно ў прафтэхвучылішчы адкрылася майстэрня па рамонце аўтамабіляў, аснашчаная сучасным абсталяваннем.

**Сяргей РУДЫ, намеснік міністра адукацыі Беларусі:**

— Мы адкрываем сур'ёзную справу. Тут маладыя людзі будуць атрымліваць прафесію, якая запатрабавана на рынку працы, якая патрэбная, важная не толькі самім хлопцам, але і дзяржаве. Мы маем намер выкарыстоўваць гэтае абсталяванне і памяшканне не толькі для патрэб установы. Аднак і ажыццяўляць прафесійную падрыхтоўку вучняў Крывіцкай сярэдняй школы.

Праект рэалізаваны пасольствам Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь і маладзёжнай рэлігійнай місіяй «Чыстае сэрца».

**Міхаіл ХАБРАС, часовы паверэны ў справах пасольства Польшчы ў Беларусі:**

— Гэты праект мае на мэце стварыць умовы для рэабілітацыі і сацыяльнай рэінтэграцыі моладзі і дае магчымасць атрымаць прафесію аўтамеханіка. Практычныя навыкі аблегчаць ім пошук і пачатак легальнай работы. І тым самым — старт для новага жыцця.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 17 (413)



■ На адкрытай прасторы

# Выстаўка, на якую можна трапіць выпадкова,

## а знайсці сюррэалізм аднаго з найлепшых беларускіх мастакоў

**Нарэшце, цёплую пару года абвясціла і традыцыйная выстаўка «Мастак і горад», што ўжо сем гадоў дэманструе сваім наведвальнікам тэндэнцыю выхаду «сапраўднага» мастацтва ў гарадскую прастору. 17 мая на плошчы Якуба Коласа ў Мінску адкрылася маштабная экспазіцыя аднаго мастака.**




Гэтым разам кампанію Марка Шагала, Казіміра Малевіча, Мікалая Селяшчука, Валянціна Губарава, творы кожнага з якіх займалі пачэснае месца на сталічнай плошчы ў мінулыя гады, дапаўняе «беларускі Сальвадор Далі» Георгій Скрыпнічэнка. Некаторыя работы сюррэаліста стануць даступнымі шырокай публіцы ўпершыню.

Выстаўка «Мастак і горад» размяшчаецца на адной з цэнтральных мінскіх плошчаў, праз якую шляхі жыхароў і выпадковых заезджых будуць праходзіць з большай імавернасцю. Таму ў мінулыя гады колькасць «наведвальнікаў» экспазіцыі лічылася мільёнамі. І, як адзначалі арганізатары, нават актаў вандалізму, чаго можна чакаць, заўважана не было.

На плошчы Якуба Коласа ўжо можна знайсці вядомыя работы Георгія Скрыпнічэнкі «Мінскія спатканні», «Шляхціц на радзіме», «Імгненні жыцця», сюррэалістычныя галаваломкі, упершыню выстаўленыя работы з альбомаў жывапісных і графічных работ мастака (Георгій Скрыпнічэнка пайшоў з жыцця ў 2015 годзе).




Шматлікія ініцыятывы апошняга часу пацвярджаюць, што па мастацтва не абавязкова ісці ў музей. Спалучэнне элітнай культуры і вуліцы становіцца папулярным і паводле распаўсюджваецца ў Беларусі, хоць адсылкі да Віцебска часоў «Сцвярджальнікаў новага мастацтва» паказваюць, што для нашай краіны такая з'ява нават натуральная. Дарэчы, апроч Мінска якраз у Віцебску пройдзе сёмая экспазіцыя «Мастак і горад»: работы Георгія Скрыпнічэнкі будуць выстаўлены тут з 20 верасня да 6 лістапада.

Канешне, выстаўка на вуліцы не прапануе арыгіналы беларускага сюррэаліста, што быццам кажа на карысць закрытых прастор, але дакладна робіць высокае мастацтва больш даступным. Лічыцца, што пасля такога лікбезу непрызвычаеным да культурнага адпачынку наведвальнікам недалёка і да музея. Альбо хоць бы часткі з іх.

Пры генеральнай падтрымцы банка ВТБ праект «Мастак і горад» рэалізуецца камунікацыйнай кампаніяй GBS і Цэнтрам сучасных мастацтваў пры падтрымцы Міністэрства культуры і Мінскага гарвыканкама.

Глядзець на творы Скрыпнічэнкі на плошчы Якуба Коласа можна да 14 верасня.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■ Прэм'ера

# ...ПАЛЁТ НАРМАЛЬНЫ!

**Муха Наташа не дае спаць, настойліва цакоча над вухам. «У чым праблема?» — здзівіцца жыхар гарадской кватэры, які прывык вырашаць такое радыкальна.**
**Ну, і дарма: гэта ж На-та-ша! Яна таксама мясцовы жыхар, частка экасістэмы, часцінка Сусвету. Без яе карціна будзе няпоўнай. Карціна свету вачыма новага жыхара вёскі Прудок — дакладна. А нам прыйдзецца зразумець, чаму яго ўспрыманне менавіта такое, падчас прагляду спектакля Купалаўскага тэатра «Радзіва «Прудок». Гэта калі яшчэ атрымаецца трапіць. Але не хачу разважаць пра «няма білетаў» і аншлагі. Хачу — пра Прудок. Там добра.**



Гэта далёка ад сталіцы: Палессе. Для гараджаніна выпраўляцца туды жыць — усё адно што збірацца ў космас. Нават не на арбіту недзе «па-над», а ў паралельную галактыку, дзе іншыя законы гравітацыі, амаль адсутнічае катэгорыя часу (істотны толькі факт, што ты ёсць) ды разумнае жыццё са сваімі прынцыпамі існавання ў наяўнасці. Усё выпрабаваў на сабе аўтар кнігі «Радзіва «Прудок» Андрусь Горват, які занатоўваў свае пачуцці падчас абсалютна рэальнага паглыблення ў той сусвет. Кінуў Мінск і паехаў жыць у... гэты Прудок. Не ў Маскву і не ў Парыж, а ў беларускую вёску.

Запісы з дзённіка — успаміны былога «зямнога» (прыземленага?) жыцця, назіранні і думкі пасля кантактаў з мясцовай цывілізацыяй — сталі кнігай. Кніга «пайшла ў адкрыты космас» — а гэта ўся прастора беларускага светаадчування, менталітэту, культуры, наогул жыцця. Актыўнасць чытачоў і захапленні наноў адкрытым сусветам прывялі да з'яўлення фільма «Ягор» і ў рэшце — да тэатральнай пастаноўкі, якую ажыццявіў той жа аўтар фільма купалавец Раман Падаляка. Ён таксама частка беларускага космасу — акцёр-зорка. Цяпер ведаю дакладна: на начным небе сярод зіхатлівых зор могуць быць планеты, якія маюць моцную атмасферу і энергетыку, здольную ўцягваць у сваю арбіту. У дадзеным выпадку яны зрэзаніравалі: космас, які спасцігаў Горват, і энергетыка Падалякі.

Яны абодва аднолькава разумеюць, чаму эротыка па-беларуску — гэта аголенае каленца Ганны Чарнушкі («Людзі на балоце» ідуць на сцэне Купалаўскага тэатра). А купалаўскі тэатр — гэта таксама мікракосмас, які зацягвае ўсіх, хто трапляе ў зону яго прыцягнення. З акцёрамі зразумела, але ж нават былога дворніка, якім працаваў Андрусь Горват, не абмінула гэтае наканаванне. Выбар працы ў дворнікаў у Мінску неблагі, з варыянтамі аплаты: чым бліжэй да культуры — тым яна меншая, затое там спытаюць пра валоданне мовай... Калі чалавек зрабіў такі выбар, то зразумела, для яго сіла прыцягнення — не фізічная, а хутчэй філасофская з'ява.

Каб больш зразумелымі былі палескія адчуванні, трэба было пачаць з гарадскіх, так і зрабіў рэжысёр Раман Падаляка. У інсцэніроўцы ёсць частка пра героя-дворніка, які ачышчаў снег на дарозе, па якой скакалі гарадскія козкі на абцасах, слухаў прыгожую кітайскую мову ў тэатры падчас экскурсій для турыстаў, дзе ў якасці экзатычнага артэфакта маглі фігураваць шкарпэткі дворніка на батарэі (не, ну выпадкова!), слухаў мамін голас па тэлефоне, абавязкова завяраў, што ўсё нармальна. Магчыма, так адказваюць блізкім касманаўты, якіх толькі прызначылі ў далёкую экспедыцыю і якім трэба час, каб усіх падрыхтаваць. І тэатр для героя стаўся свайго роду цэнтрам падрыхтоўкі да касмічнай вандроўкі.

Усё пазначана адразу: з першых рухаў героя па сцэне мы адчуваем яго наканаванне: камбінезон дворніка нагадвае скафандр. Далей адчуваем асаблівы космас Беларусі праз выяўленне часткі тэатральнай біяграфіі. Сусвет ахопліваe гледача праз мастацкі вобраз: умоўны касмічны стыль, што прыдумала мастачка Кацярына Шымановіч, вытрыманы ад пачатку да канца. Зоркі зіхацяць у чорнай прасторы малой сцэны — і бачыш, якая яна, аказваецца, вялікая...

Старая дзедава хата напачатку як кропка сярод зорнага неба. Глядзіш на яе нібыта з нябесных вышынь. Адразу прыгадаўся «Салярыс» Таркоўскага з вандроўнікамі, якія рушаць даследаваць разумнае жыццё іншага паходжання, а ў выніку думкамі вяртаюцца да таго, што засталося далёка дома, а значыць, глыбока ў сабе. Напрыканцы яны ўглядаюцца ў хаціну з утульнымі вокнамі і гасцінным ганкам, а наш касманаўт ідзе далей і даследуе тое, што ўнутры.




Пры набліжэнні да хаціны бачыш: ці не сам дзед глядзіць адтуль праз акно? Даўно няма дзеда, але падобны на яго сам герой — адзін твар з рысамі, што выявіла (запомніла?) шкло. Самае цікавае пачнецца потым, у самой хаце і вакол яе. Новае жыццё падорыць новых сяброў, іншай формы розуму. Дзіўна было ўявіць, якім чынам можна на сцэне паказаць ката Рому. Але ён побач з героем — як выява на мяккай падушцы, і сапраўды ж можна вось так сядзець на старым сінім металічным ложку і гладзіць яго. Намаляваная і каза са званочкамі, якія дзінькаюць, як пры дойцы, — ён называе яе Цёця, у гонар былой гаспадыні. Муха Наташа — абсалютна рэальная: так выглядае аніміраваны персанаж. Наогул відэарад (аўтар Глеб Куфцерын) дазваляе ў драматычным спектаклі стварыць лініі, важныя (смешныя, кранальныя) у кнізе, альбо абазначыць моманты асаблівага настрою ці атмасферы: месяц, які адбіваецца ў калодзежы, ці «жывыя» кроплі дажджу. Усё тое, без чаго немагчыма было б адчуванне нашага зямнога космасу з чалавечым тварам.

І тут лагічнае існаванне людзей — яны жывуць у Прудку! Часам абаяльныя і прывабныя, гасцінныя і добрыя, з граматамі і проста шаноўныя, спагадлівыя і тыя, што маюць асаблівую зацікаўленасць у вашай спагадзе. Тыя, што часам здаюцца гуманоідамі (у адпаведным стане), але пры далейшых кантактах аказваюцца вельмі мілымі людзьмі з тонкай душэўнай арганізацыяй. Яны такія: падкажуць, як абыходзіцца з зямлёй, што садзіць, з кім пагаварыць. Ды хіба не галоўнае акенца ў свет для вяскоўца — радзіва, якое грае асаблівую ролю ў спектаклі, такі ж «жывы» персанаж сярод іншых, хоць і рарытэтны прыбор са сваёй логікай і здольнасцю адчуваць героя.

Праўда, тэатральная пастаноўка не можа адлюстраваць кнігу цалкам. Выбар эпізодаў — справа аўтараў інсцэніроўкі, якую рабілі Раман Падаляка і артыст Міхаіл Зуй (іграе галоўнага героя), адчуваецца, што ім хацелася паказаць як мага больш. Але кожны пры чытанні кнігі зможа выбраць сваіх любімых персанажаў.

Іх не так і мала, аказваецца, у тым паралельным гарадскому свеце. Увасабляюць усіх герояў-вяскоўцаў на сцэне Святлана Анікей і Дзмітрый Есяневіч. Для таго каб пераўвасобіцца, дастаткова дадаць нейкую дэталь гардэроба (тоўстыя вязаныя шкарпэткі ці нагавіцы, шапку ці швэдар) — у гэтым сэнсе стыль касмічнай вопраткі застаецца базавым: кожны прудковец — носьбіт таго асаблівага космасу. Асаблівы космас купалаўцаў дазваляе ім настолькі (часам занадта) паглыбіцца ў вобразы, што сваіх землякоў-палешукоў бачыш як рэальных, у якіх насамрэч усё «е». Адна ёмістая літара абазначае палаяшуцкі дух і нават дыялект на працягу ўсяго спектакля, што ідзе на літаратурнай беларускай мове. Але нават гэтай дэталі дастаткова, каб зразумець: «е» — гэта не літара. Гэта наяўнасць. Прысутнасць. Існасць. І неспазнанасць да канца.

Такіх Прудкоў у нас шмат па Беларусі. У кожнага — свой, дзе можна, вось як галоўны герой, «выспявацца як нацыя». З дзедавай хатай, нават калі там ужо памянялі шыбы на вокнах, праязджаючы міма якой усё адно міжволі думаеш: мо выглядаюць? Кідаеш позірк: ці ўсе дрэвы каля хаты? Згадваеш: дзе той калодзеж, у якім адлюстроўваецца неба?

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Фестываль

## Аляксей ЛЯЛЯЎСКІ:

# «БЕЛАРУСЬ ПАКУЛЬ НЕ ВЕЛЬМІ ТЭАТРАЛЬНАЯ КРАІНА»

**Што-што, а лялечны тэатр у нашым культурным асяроддзі з'яўляецца неаспрэчным прадметам увагі і ўсеагульнага гонару. Маецца на ўвазе, вядома, асаблівая форма тэатральнага мастацтва, а не спектаклі для дзяцей. Таму так дарэчы, хоць і раз на два гады, збірацца на Міжнародным фестывалі тэатраў лялек у Мінску. Чарговы, ужо дзясяты, распачаўся ўчора і традыцыйна прапанаваў гледачу беларускую праграму, у якой па азначэнні павінен быць прадстаўлены кожны беларускі лялечны тэатр, і замежную, куды ўпершыню трапілі пастаноўкі з Ірана, Балгарыі і Іспаніі. З такой нагоды мы сустрэліся з Аляксеем Ляляўскім, галоўным рэжысёрам Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, мастацкім кіраўніком фестывалю, заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі — увогуле культавай асобай у сваёй сферы, чые прафесійныя кантакты звязаны таксама з Расіяй, Германіяй, Польшчай, Бельгіяй, Фінляндыяй, Нідэрландамі... Так ці інакш, пра лялечны тэатр у нашай краіне наўрад ці хто ведае больш за яго, таму да Аляксея Ляляўскага мы прыйшлі як да рэжысёра, адборшчыка і, што немалаважна, гледача.**


Фота Станіслава ВІГДОРЧЫКА.

***— У нашым прафесійным асяроддзі часам кажуць, што з усяго беларускага тэатра менавіта лялечны трымае планку, застаецца ў авангардзе і заслугоўвае пашаны. Нават той факт, што ў краіне ёсць асобны для гэтага кірунку фестываль, шмат пра што кажа. А вы якім бачыце становішча нашага тэатра лялек?***

— Казаць, што мы недзе наперадзе ці ззаду, няправільна, бо мы ўсе варымся ўнутры гэтай кашы, а тым больш займаемся крыху рознымі відамі мастацтва. Збоку беларускі тэатр лялек ацэньваюць вельмі добра, выключэнняў тут няма, хоць калектывы трымаюцца розных ідэй і стыляў, па-іншаму бачаць сваю аўдыторыю. Аб'ектыўная ацэнка — гэта ці запрашаюць нас да сябе, што пішуць і, нарэшце, ці запрашаюць другі раз. Наколькі я валодаю інфармацыяй, усе нашы тэатры запатрабаваныя, не тое што — з'ездзілі адзін раз, і пра іх забылі. Шчыра магу сказаць, хоць, можа, гэта і гучна, — беларускі лялечны тэатр з'яўляецца часткай еўрапейскага культурнага працэсу. Я пра гэта ўвогуле ніколі не думаў, пакуль крытык з Сербіі не запытаўся, як нам ўдаецца быць такімі запатрабаванымі ў свеце. Што датычыцца агульнай папулярнасці ўнутры, тут мы, на жаль, не выключэнне: Беларусь пакуль не вельмі тэатральная краіна. Хоць дзякуючы міжнародным фестывалям у Мінску, Магілёве, Брэсце, нават тэатральнай праграме на Славянскім базары ў Віцебску, нешта мяняецца.

***— Вы маеце на ўвазе, публіка становіцца больш зацікаўленай?***

